ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.34 (3250) ● ЧАЦВЕР, 8 ВЕРАСНЯ, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Высокі клас
Беларуская школа прызнана лепшай у Вільнюсе сярод школ нацыянальных меншасцяў Стар. 2

Знічкі Айчыны
Стар. 3

Мальберт каля млына
Колішнія волаты-ветракі ажываюць на жывапісных палотнах мастака Віктара Нямцова Стар. 4

ХЛЕБ І ПЕСНЯ

Рэпетыцыя з аркестрам

Рыхтуючыся да “Дажынак”, харашэ Маладзечна — сёлетняя сталіца свята

Іван Ждановіч

Як вядома, сталіцай “Дажынак” у Беларусі кожны год становіцца іншы горад. І па добрай традыцыі да галоўнага хлебаробскага фэсту ў абранай гарадской гаспадарцы робіцца не проста “генеральная ўборка” — ідзе вялікая рэканструкцыя! А ўлады Маладзечна, па ўсім бачна, замахнуліся на праекты, пра якія іншым толькі марыць. Прыкладам, яшчэ ў сярэдзіне ліпеня пры ўездзе ў горад з боку Мінска ўстаноўлена велічная стэла з бронзавай выявай Божай Маці, а таксама гербам горада. Кампазіцыю “Пакроў Прасвятой Багародзіцы”, 15 метраў у вышыню, стварылі скульптар Аляксандр Фінскі і архітэктар Армэн Сардараў. Гэта і будзе галоўны ўязны знак сталіцы “Дажынак-2011”, а непадалёк ад яго расце новы мікрараён.

Яшчэ адной адметнасцю Маладзечна ўжо стала і незвычайная скульптура-фантан на тэму Купалля — яна была адкрыта якраз да XI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Дарэчы, у бронзава-гранітнай кампазіцыі скульптара Ула-дзіміра Жбанава і архітэктара Марата Гроднікава ёсць прыгожая закаханая пара, вакол якой у горадзе кіпелі немалыя страсці: некаму падалося, што маладыя людзі маглі б выглядаць і больш сціпла... Тым не менш, кампазіцыя з трылісніка, задуманая як сімвал сям’і, гарманічна ўпісалася ў прастору Цэнтральнай плошчы Маладзечна, непадалёк ад гарадскога парка.

Кампазіцыя “Пакроў Прасвятой Багародзіцы”

У горадзе грунтоўна рэканструявана дзіцячая бальніца, хуткімі тэмпамі ўзводзіцца Спартыўна-відовішчны цэнтр — з вялікай лядовай арэнай, аквапаркам, басейнам, боўлінг- і фітнэс-клубамі, трэнажорнай залай і кафэ. І, нарэшце, у парку Перамогі адкрыўся летні амфітэатр. Між іншым, упершыню галоўныя падзеі “Дажынак” пройдуць на стацыянарнай сцэне. Яе і “абкаталі” напрыканцы жніўня ўдзельнікі фестывалю беларускай песні і паэзіі. І для тэлевізійшчыкаў, гукарэжысёраў, святлатэхнікаў, якія будуць працаваць тут пад час “Дажынак”, гэта была і рэпетыцыя свята, прычым са знакамітым Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Фестываль беларускай песні і паэзіі жыве ў многім дзякуючы намаганням маэстра. Фэст задуманы для таго, каб зберагаць і развіваць традыцыі беларускай музыкі, мелодыку нацыянальных песень, якія маюць непаўторны каларыт. На фестывалі ў Маладзечне гучаць песні на беларускай мове ў выкананні беларускіх артыстаў. У 2007-м песенны форум прысвячаўся 125-м угодкам Янкі Купалы і Якуба Коласа, а сёлета шмат кампазіцый спявалася на вершы Максіма Багдановіча.

На прыгожых маладзечанскіх вуліцах шмат моладзі

Дарэчы, фэст ладзіцца ў Маладзечне з 1993 года, а сёлета ён прайшоў не ў чэрвені, як звычайна, а ў канцы жніўня — будаўнікі стрымалі слова, закончылі ў амфітэатры да фестывальнага гала-канцэрта асноўныя работы.

Сёлетні фэст прысвячаўся 70-мугодкам Уладзіміра Мулявіна: песні з рэпертуару “Песняроў” гучалі і пад час канцэрту-адкрыцця, і на конкурсе маладых выканаўцаў, дзе пераможцай стала Кацярына Худзінец. Увогуле ж свята ўпершыню праходзіла на розных пляцоўках горада: у Палацы культуры, Маладзечанскім музычным вучылішчы імя Міхала Клеафаса Агінскага. На гала-канцэрце ў амфітэатры, які ўмясціў амаль тры тысячы гледачоў, не было свабодных месцаў. Што ж, Маладзечна, услед за Віцебскам атрымаўшы зручную сцэну, мае ўсе шанцы ў будучыні запрашаць на свае фестывалі самых папулярных артыстаў — як Беларусі, так і замежжа. Ну а свой “галоўны экзамен” сцэна амфітэатра будзе трымаць пазней, калі сельскія працаўнікі збяруцца ў Маладзечне на “Дажынкі”.

ПАМЯЦЬ

Яны таксама набліжалі Перамогу...

На вядомых ва ўсім свеце Піскароўскіх могілках ёсць гранітная стэла — знак памяці пра амаль12 тысяч беларускіх юнакоў і дзяўчат. У цэнтры помніка размешчана рэльефная бронзавая выява падлетка, за спіной жа віднеецца толькі контурная цень кожнага другога з яго землякоў, які адышоў з блакаднай зямлі ў неўміручасць, аказаўся, па нашых сённяшніх мерках, героем. На стэле надпіс: “Суайчыннікам, якія загінулі ў блакаду, рамеснікам вучылішчаў Ленінграда ад беларускага народа”. Звыш чатырох тысяч з іх, у тыя часы званых “фэзэўшнікамі”, былі ўзнагароджаны пасмяротна медалём “За абарону Ленінграда”. У кожны памятны дзень помнік патанае ў кветках. Так было і летась 10 верасня, калі зроблены змешчаны тут здымак.

Адкуль жа ў перадваенным Ленінградзе з’явілася так шмат беларускіх падлеткаў-рамеснікаў? Сакрэт просты. У той час па ўсім Саюзе планавалася будаўніцтва буйных прадпрыемстваў. І ў Беларусі збіраліся ўзводзіць трактарны, аўтамабільны і іншыя заводы. Выкананне планаў патрабавала мноства кваліфікаваных рабочых рук, якіх у краіне для такіх мэтаў не ставала. І таму 2 кастрычніка 1940 года Савет Міністраў СССР выдаў Указ “Пра дзяржаўныя працоўныя рэзервы”, паводле яго прымаліся меры, каб забяспечыць неабходны прыток маладых рабочых кадраў у народную гаспадарку. У буйных гарадах адкрываліся рамесныя вучылішчы і школы фабрычна-завадскога навучання (ФЗН). Камсамол заклікаў моладзь: “Вучыцца рабочым прафесіям!” Каб атрымаць адпаведную тэхнічную адукацыю, толькі ў адзін Мінск прыбыло каля 50 тысяч падлеткаў. Вучылішчы горада, натуральна, прыняць такой колькасці жадаючых не маглі. І тады па распараджэнні з Масквы ажно 24 тысячы прэтэндэнтаў былі накіраваны ў Ленінград, дзе іх ужо чакалі на буйнейшых прадпрыемствах горада — такіх, як завод імя Кірава, “Арсенал”, хімкамбінат. → Стар. 2

Высокі клас

Беларуская школа прызнана лепшай у Вільнюсе сярод школ нацыянальных меншасцяў

Алена Юркявічэне

За парты віленскай беларускамоўнай сярэдняй школы імя Ф. Скарыны ў новым навучальным годзе селі 185 вучняў. Упершыню школьныя дзверы адчыніліся і для шаснаццаці першакласнікаў. А сама школа нядаўна была прызнана лепшай у сталіцы Літвы сярод школ нацыянальных меншасцяў.

Выступаючы на ўрачыстай лінейцы, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын адзначыў той вялікі клопат, які праяўляе аб школе этнічная радзіма. Дзякуючы дапамозе дзяржустаноў Беларусі пастаянна абнаўляецца матэрыяльная база школы, бібліятэка папаўняецца беларускімі кнігамі і сучаснымі метадычнымі выданнямі. У школе быў зроблены рамонт, набыта новая мэбля і школьны аўтобус, навучальнае абсталяванне. Вось так дапамагла краіна суайчыннікам.

А 1 верасня пасол уручыў першакласнікам кнігу "Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь першакласніку". Вучні таксама атрымалі памятныя падарункі ад Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта — партфелі і наборы канцылярскіх прылад.

Вучыцца ў віленскай беларускамоўнай школе — цікава!

"Я шосты год у Дзень ведаў наведваю школу і бачу, як яна прыгажэе, становіцца ўсё больш папулярнай ў беларусаў Літвы, — адзначыў Уладзімір Дражын. — Пяць гадоў таму ў ёй вучыліся 130 вучняў, а сёння ўжо 185". Ён адзначыў, што невыпадкова школа карыстаецца папулярнасцю і сярод усіх агульнаадукацыйных школ і гімназій Літвы — яна адзінаццатая. Міністэрства адукацыі Беларусі таксама ўзнагародзіла школу граматай за захаванне беларускіх традыцый і мовы.

Фрэскі мінуўшчыны – для будучыні

Іван Ждановіч

Актывісты Полацкага зямляцтва, створанага некалькі гадоў таму, працуюць на карысць роднага горада ў цесным кантакце з уладамі Полацка. Усё больш турыстаў на яго вуліцах. Вядома ж, многія маршруты вядуць сёння да Ефрасіннеўскага манастыра. Менавіта там у XII стагоддзі — гісторыкі мяркуюць, каля 1159 года — паўстала знакамітая Спасаўская царква. Яна дзівам ацалела праз усе вякі, праз ліхалецці непадалёк ад рэчкі Палаты, а ў ёй — і ўнікальныя фрэскі XII стагоддзя.

Спасаўская царква па праву лічыцца адметным помнікам Полацкай школы дойлідства. Тое падаецца неверагодным, аднак пад слоем тынку ўнутры будынку рэстаўратары знайшлі і непаўторныя фрэскі, выкананыя старажытнымі майстрамі: насценныя творы захаваліся да нашых дзён. Гледзячы на іх, мы быццам вяртаемся ў мінуўшчыну. Але ці ёсць у фрэсак будучыня? Так, і некаторыя з іх ужо часткова рэстаўраваныя. Сёння спецыялісты сцвярджаюць: мастацтва фрэсак нагадвае жывапіс храмаў Ноўгарада і Кіева, бярэ пачатак з візантыйскай традыцыі. І ў той жа час яны сведчаць пра існаванне высокага, старажытнага і самабытнага мастацтва Полацкай зямлі.

Цяпер у Спасаўскай царкве прадаўжаюцца рэстаўрацыйныя работы, яны патрабуюць немалых грашовых выдаткаў. Таму Беларускі фонд культуры і Полацкае зямляцтва супольна звярнуліся па добраахвотныя ахвяраванні да ўсіх добрых людзей, хто жадае далучыцца да пачэснай справы, каб зберагчы ўнікальную мастацкую спадчыну для нашчадкаў.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Дзякуй, Марыя!

Трэці год студэнты, якія родам з рэгіёнаў, найбольш пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі, атрымоўваюць стыпендыі з фонду сусветна вядомай тэнісісткі Марыі Шарапавай

Кацярына Мядзведская

У Гомелі і цяпер жыве бабуля Марыі Галіна Дзям'янаўна — знакамітая ўнучка часам прыязджае да яе ў госці. Дарэчы, маленькая Маша сама некалькі год правяла ў горадзе над Сожам. І вось сёння зорка сусветнага тэнісу не забылася пра сваіх, уласна кажучы, землякоў. Фонд Марыі Шарапавай разам з Праграмай развіцця ААН ужо трэці раз выдзяляе стыпендыі для студэнтаў, якія маюць праблемы са здароўем або не менш дзесяці год жылі ў адным з раёнаў Гомельскай, Брэсцкай ці Магілёўскай абласцей, найбольш пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. "Шарапава пажадала, каб дапамогу атрымоўвалі студэнты творчых спецыяльнасцяў, — заўважае каардынатар праекта, супрацоўніца ПРААН у Беларусі Вольга Шыбека. — Тыя, хто прэтэндуе на стыпендыю, праходзяць конкурс, які праводзіцца сярод першакурснікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Пераможцы фінансава падтрымліваюцца да канца вучобы".

Фінансавая дапамога, па праўдзе сказаць, немалая — тры з паловай тысячы долараў у год. Ды і патрабаванні да стыпендыятаў высокія: добра вучыцца, удзельнічаць у выставах, валанцёрскім руху, навуковай дзейнасці. Цікава, што ўсе, хто стыпендыю атрымоўвае, ужо цяпер вельмі моцныя ў творчасці. Напрыклад, вучыцца ва ўніверсітэт ці акадэмію яны прыйшлі пасля мастацкіх школ, маюць аўтарскія працы. Прыкладам, Юлія Леанкова, студэнтка другога курса Акадэміі мастацтваў, яшчэ да паступлення на факультэт дызайна праілюстравала кнігу казак Ганса Хрысціяна Андарсана, зрабіла яе макет. Напярэдадні 25-годдзя чарнобыльскай трагедыі ўсе стыпендыяты ўдзельнічалі ў выставе "Незагойная рана", якую ладзіла Акадэмія мастацтваў. Пасля яны падарылі свае працы аднаму з дзіцячых цэнтраў Гомельскай вобласці.

Пад час сёлетняй уступнай кампаніі таксама вызначаны шэраг прэтэндэнтаў на атрыманне імянной стыпендыі. З іх на пачатку кастрычніка Фонд Марыі Шарапавай вылучыць трох шчасліўчыкаў. Пры падрыхтоўцы праграмы для таленавітай моладзі з пацярпелых раёнаў тэнісістка прызналася: "Я заўсёды хацела прыўнесці свой уклад у працэс аднаўлення рэгіёна, з якім звязана і частка майго жыцця, дзе жывуць родныя. Дапамагчы маладым людзям дасягнуць мары — добры спосаб пераадолення спадчыны Чарнобыля".

Марыя Шарапава (другая злева) і стыпендыяткі яе фонду

Заснаванне імянной стыпендыі — не першы дабрачынны крок Марыі Шарапавай. У 2007 годзе яна стала Паслом добрай волі Праграмы развіцця ААН. З таго часу на сродкі фонду ў Гомельскай вобласці былі набыты камп'ютары для многіх школ, адноўлены спартыўныя збудаванні. У Брагінскім раёне, напрыклад, адкрыліся пяць філіялаў дзіцячай музычнай школы і нават кабінет казкатэрапіі. А ў Чачэрску пабудаваны цэнтр экалагічнага выхавання.

ПАМЯЦЬ

Яны таксама набліжалі Перамогу...

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Вось як згадвае свой прыезд у паўночную сталіцу юны тады беларускі падлетак С. Скамарох. Калі хлопцы на завод прыйшлі, "уражанне было такое, нібы мы на другую планету трапілі… Велізарныя цэхі… Усюды станкі, шум. Нам да ўсяго хацелася дакрануцца. А нам казалі: "Пачакайце! Аглядайце, прызвычайвайцеся, на гэтых станках вы будзеце працаваць! Майстрам нашай сёмай слясарнай групы быў Аляксей Аляксеевіч Аляксееў, ён замяняў нам і бацьку, і маці, і брата. Мы яго вельмі паважалі і любілі. Калі б цяпер ён знайшоўся, я б яго да Мінска на руках нёс".

Аб'яўленне вайны падлеткі перажывалі вельмі цяжка, асабліва — вестку, што немцы занялі Беларусь. Яны ж аказаліся адрэзаны ад родных мясцін, бацькоў. Некаторыя па начах плакалі… І прыйшоў час, калі вучоба прыпынілася, бо пачалася мабілізацыя, а за станкі сталі жанчыны і дзеці. Больш за 40 тысяч беларускіх хлопцаў і дзяўчат па 16—17 гадоў працавалі для фронту ў цэхах прадпрыемстваў акружанага фашыстамі Ленінграда. Па 12–14 гадзін яны знаходзіліся за станкамі ў холадзе і голадзе. Той жа С. Скамарох успамінае: "Да вайны балванку даўжынёй 1 метр 25 см я ставіў на станок адзін. А праз год з пачатку блакады 8 чалавек ледзь-ледзь спраўлялі-ся". А В. Паўлюкевіч расказвае: "Кожную раніцу прачынаешся і глядзіш: Міша жывы — добра, Пеця жывы — добра… Таго, хто памёр, разам з ложкам перастаўлялі ў другі, халодны пакой". Днём па вуліцах Ленінграда хадзілі машыны, у іх збіралі памерлых і вывозілі на Піскароўскія і іншыя могілкі. Юныя рамеснікі паміралі ад голаду, гінулі ў час артабстрэлаў і бамбёжак горада, траплялі пад лёд Ладагі разам з грузавікамі, на якіх зусім аслабелых падлеткаў вывозілі на Вялікую Зямлю.

Ля помніка суайчыннікам, якія загінулі ў блакаду

Прайшоў час. У 1996 годзе па хадайніцтве Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і дзякуючы рашэнню Прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына на тэрыторыі Піскароўскага мемарыяла ўзнеслася стэла ў памяць пра рамеснікаў. Спраектаваў яе заслужаны работнік культуры Расіі Сямён Цымрынг, у мінулым таксама блакаднік і рамеснік. Грошы на граніт прыслалі з Беларусі, а падрыхтоўку і ўстаноўку помніка пецярбуржцы зрабілі бясплатна.

І вось прайшло яшчэ дзесяцігоддзе. Неяк я, ужо стаўшы членам пецярбургскага спецыялізаванага Фонда расійска-беларускага супрацоўніцтва "Белыя Росы", пайшла на Піскароўскія могілкі і знайшла там стэлу ў запусценні... Я звярнулася да дырэктара мемарыяла, каб мне дазволілі высадзіць там кветкі. На дапамогу прыйшлі вучні 334-й школы Санкт-Пецярбурга. Па святах гэтае месца цяпер наведваюць жыхары горада, і экскурсіі з Мінска ўжо сталі з'яўляцца: ускладаюцца да стэлы кветкі і вянкі. Пішучы гэтыя радкі, цвёрда веру, што такая ж цырымонія паўторыцца і сёлета ў верасні, у 70-ю гадавіну таго дня, калі вакол Ленінграда замкнулася кола варожай блакады.

Раіса Барадзіна,
жыхарка Санкт-Пецярбурга,
ураджэнка Веткаўскага раёна
Гомельскай вобласці

Сёлета валожынская старонка ўразіла: пайшлі дажджы, і ўзровень вады ў рацэ Валожынка падняўся настолькі, што прарвала дамбу, пры тым заліло некалькі гарадскіх вуліц. Такога ў Валожыне і не памятаюць. Мо, думаецца, маленькая рака нагадала пра сябе яшчэ і таму, што дарэмна яе некалі каналізавалі – ад горада да вёскі Расолішкі, на працягу болей як 20 кіламетраў. А ўсяго ж ракі тае – кіламетраў 35... Мы ж згадаем тых ураджэнцаў горада і ваколіц, хто бачыў сваю Валожынку ва ўсёй красе. Вішнева, Багданаў, Пяршаі, Лоск, Ракаў, Івянец, Ратынцы, Доры… Кожнае з паселішчаў здзіўляе сваёй багатай гісторыяй, сваімі адмецінамі. І, канешне ж, – людзьмі. Тут і моўныя залацінкі свае. Прыкладам, гавораць на Валожыншчыне так: “Як гэта ты куплёў і не бачыў што? Аднаго чорта прадоў, другога купіў” (гэта ў Гіліках); “Жалезны ток, свіны пераскок, аўсяны пасад” (загадка з Аўгустова: пра патэльню, сала, бліны); “Чатыры чатырначкі, пятая лавушачка, шостая – жывушачка” (пра вяроўку, калыску і дзіця загадваюць там жа).

Валожын. Кірмаш

Валожын

Знічкі Айчыны

Валожын. Палац Тышкевічаў

Валожын. Царква

Алесь Карлюкевіч

Пра мову валожынскіх паселішчаў успамінаю заўжды, калі на вочы трапляюць рэпрадукцыі работ разьбяра з гарадскога пасёлка Івянец Апалінарыя Пупко (ён нарадзіўся ў 1893 годзе). Закончыў мясцовае чатырохкласнае народнае вучылішча. “Несцерка” (1965), “Жалейка” (1970), “Ганчар” (1972), “Гусляр” (1978), “Сялянка” (1982) — гэтыя і іншыя работы майстра дыхаюць цяплом, дабрынёю, выпраменьваюць святло як асаблівую энергетыку беларускага дрэва. І столькі маўклівае дрэва можа расказаць, што часам дзіву даешся!.. З яркіх творчых асоб Валожыншчыны — сям’я Паплаўскіх. Так, у вёсцы Далідовічы ў 1949 годзе нарадзілася Ядвіга Паплаўская — кампазітар, эстрадная спявачка, аранжыроўшчык, музыкант. Беларускую кансерваторыю закончыла двойчы — у 1972 годзе па класе фартэпіяна і ў 1988-м па класе кампазіцыі. З 1971 года спявала ў ансамблі “Верасы”. У 1989-м разам з мужам Аляксандрам Ціхановічам стварыла Тэатр песні. Напісала кантату “Сын зямлі”, сімфанічную паэму, санату, дзіцячыя п’есы для фартэпіяна, хароў, шэраг рамансаў і песен. А ў вёсцы Сівіца ў 1912 годзе нарадзіўся бацька Ядвігі — Канстанцін Іосіфавіч Паплаўскі, харавы дырыжор, кампазітар, педагог. Доўгія гады працаваў у Дзяржаўным акадэмічным народным хоры Беларусі — галоўным хормайстрам, музычным і мастацкім кіраўніком. У 1967 годзе Канстанцін Паплаўскі атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі.

З валожынскага Ракава — артыст оперы Вікенцій Фёдаравіч Бруй (нарадзіўся ў 1912 годзе). У перадваенныя гады — артыст Дома Чырвонай Арміі ў Мінску, саліст ансамбля Беларускай ваеннай акругі. У 1944–48 і 1950–59 гадах Вікенцій Фёдаравіч працуе салістам хора, а пасля салістам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Аматары опернага мастацтва старэйшых пакаленняў, відаць, і цяпер памятаюць ураджэнца Валожыншчыны ў оперных спектаклях “Зорка Венера” Ю. Семянякі, “Князь Ігар” А. Барадзіна, “Фаўст” Ш. Гуно… У 1971 годзе В. Бруя ўганаравалі званнем заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі. Памёр Вікенцій Фёдаравіч у 1985 годзе.

Аглядаючы розныя вуліцы Валожына, узіраючыся ў маўклівыя абліччы камяніц і старых драўляных дамкоў, ведайце: у гэтым горадзе нарадзіліся вучоныя, пісьменнікі, ваеначальнікі, акцёры… Свае першыя крокі ў Валожыне зрабіла Таццяна Уладзіміраўна Ліхачова (нарадзілася ў 1952 годзе). Закончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З 1972 года працуе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа. Крытыкі адзначаюць яе ролі ў спектаклях “Сымон-музыка” па Я. Коласу, “Пакахай мяне, салдацік!” па В. Быкаву, “Дзядзька Ваня”, “Вішнёвы сад” А. Чэхава, “Рамэа і Джульета”, “Кароль Лір” У. Шэкспіра. Заслужаная артыстка Беларусі Таццяна Ліхачова — уладальніца многіх тэатральных прэмій.

Валожын — радзіма доктара фізіка-матэматычных навук Алега Ігнатавіча Таўгеня (1962–2011). Вельмі рана, у 1993-м, абараніў доктарскую дысертацыю, праз два гады атрымаў званне прафесара. У коле навуковых зацікаўленняў вучонага былі розныя праблемы, задачы алгебры, методыка выкладання матэматыкі, інфарматызацыя адукацыі. У 2000 годзе Алега Ігнатавіча прызначылі рэктарам Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Заўчасная смерць вучонага-матэматыка і арганізатара педагагічнай справы — непапраўная страта для сістэмы адукацыі Беларусі.

У 1948 годзе ў валожынскай вёсцы Кацёўшчына нарадзіўся Мечыслаў Эдвардавіч Часноўскі, цяпер ён — рэктар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Больш за дваццаць гадоў выкладаў розныя гістарычныя дысцыпліны ў Беларускім дзяржуніверсітэце, быў на дыпламатычнай рабоце. Мечыслаў Эдвардавіч займаецца даследаваннямі сацыялістычных пераўтварэнняў у заходніх абласцях Беларусі ў 1944-50-я гады, а таксама беларуска-польскіх палітычных адносін. Доктар гістарычных навук, прафесар М. Часноўскі напісаў кнігі “Постсацыялістычныя краіны на шляху пераўтварэнняў і еўрапейскай інтэграцыі” (1997), “Краіны Сярэдняй Еўропы ў 1990-я гг.” (2002), “Гісторыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь” (2007).

Валожыншчына дала беларускай культуры і яркую сям’ю Янушкевічаў: браты Язэп, Валяр’ян, Фелікс выхаваны ў прасторы мястэчка Ракаў. Валяр’ян Язэпавіч нарадзіўся ў 1962 годзе. Закончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, пасля — і творчыя майстэрні Акадэміі мастацтваў СССР у Мінску. Працуе ў станкавай скульптуры, жывапісе. Валяр’ян Янушкевіч — аўтар помніка М. Агінскаму ў Маладзечне, станкавых кампазіцый, прысвечаных дзеячам беларускай гісторыі. Фелікс Язэпавіч (нарадзіўся ў 1954 годзе) таксама вучыўся ў Тэатральна-мастацкім інстытуце і акадэмічных майстэрнях, але, зразумела, крыху раней. Сярод твораў Ф. Янушкевіча — карціны “Гэй, славяне, гэй, улане! (Партрэт бацькі)”, трыпціхі “Кастусь Каліноўскі”, “Лёс Рагнеды, ці Сцяна памяці” і іншыя працы, у якіх жывапісец выяўляе свае погляды на айчынную гісторыю. Язэп Янушкевіч — кандыдат філалагічных навук, нарадзіўся ў 1959 годзе. Займаецца гісторыяй беларускай літаратуры. Кнігі, якія ён падрыхтаваў, — сапраўдная бібліятэка, што пралівае святло на лёс беларускага прыгожага пісьменства: “Беларускі Дудар” (1991), “У прадчуванні знаходак” (1995), “За архіўным парогам” (2002)…

Валожын, Валожынская старонка — край, вандруючы па якім можна смела зазіраць у самыя далёкія таямніцы беларускай гісторыі, беларускай культуры. Важна толькі пры гэтым памятаць, што гісторыю стваралі і ствараюць людзі.

© В поисках утраченного Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

У палотнаў мастака Віктара Нямцова — адметная эстэтыка

Мальберт каля млына

Колішнія волаты-ветракі ажываюць на жывапісных палотнах мастака Віктара Нямцова

Кацярына Мядзведская

Прафесар Акадэміі мастацтваў, аўтар рэльефаў у будынку Белдзяржфілармоніі, вітражоў у Тэатры юнага гледача Віктар Нямцоў ужо доўгі час захапляецца млынамі. Пакінутыя, старыя, яны настолькі натхняюць мастака, што на карцінах выглядаюць як сапраўдныя архітэктурныя шэдэўры — падобныя на замкі ці палацы. Але ў іх не жывуць прывіды і ведзьмы. Хоць, як прызнаўся сам аўтар на адкрыцці выставы ў Нацыянальным гістарычным музеі, ён верыць у паданні. Да млыноў жа ставіцца як да помнікаў мінулага, матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. І гэта зразумела. Млыны былі сапраўднымі памочнікамі чалавека — з іх узнікненнем хлеб стаў вырабляцца значна хутчэй. Цяпер жа ветракі — як напамін пра нашу гісторыю.

Вядома, з даўніх часоў млыны натхнялі творцаў. Да іх выявы звярталіся мастакі розных плыняў і стыляў. Сярод іх былі і беларускія пейзажысты Фердынанд Рушыц, Станіслаў Жукоўскі, Віталь Цвірка.

А Віктар Нямцоў і сёння малюе старыя ветракі, будынкі якіх выраблялі раней з дрэва і каменю, а потым і з цэглы. Ён вывучае гісторыю кожнага млына, знаходзіць былыя велічныя выявы млыноў у кнігах і ў архіўных дакументах. І на сваіх палотнах ён па крупіцах вымалёўвае гэтыя волаты, па-майстарску ўпісваючы іх у сучасныя пейзажы. Аўтар сцвярджае, што займаецца гістарычнай маляўнічай рэканструкцыяй. А гэта, між іншым, зусім новы тып краязнаўчага пейзажу.

Дарэчы, на першай "млынавай" выставе мастак прадставіў каля трыццаці жывапісных палотнаў. У большасці сваёй на іх — уяўленні аўтара пра тое, якімі маглі б быць колішнія волаты-ветракі.

Пішыце і перамагайце!

Сярод сродкаў масавай інфармацыі суайчыннікаў за мяжой ладзіцца конкурс на лепшыя публікацыі

Да ўдзелу ў конкурсе, які ладзіць апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Беларусі, запрашаюцца як СМІ беларускай дыяспары, так і журналісты з іншых краін, якія надаюць увагу беларускай тэматыцы. Прымаюцца як раздрукаваныя, так і электронныя матэрыялы, у тым ліку радыё- і тэлесюжэты, што пабачылі ці пабачаць свет з 1 красавіка 2011 да 1 красавіка 2012 года.

Конкурс праводзіцца для папулярызацыі грамадскай дзейнасці замежных арганізацый суайчыннікаў, якія зберагаюць гістарычна-культурную спадчыну беларускага народа, пашыраюць сувязі з гістарычнай радзімай. А ўзнагароджанне пераможцаў пройдзе пад час чарговай міжнароднай выставы "СМІ ў Беларусі".

Узрост вымяраецца стагоддзямі

Таццяна Пастушэнка

Кніга дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, прафесара Рамана Матульскага "З мінулага ў будучыню. Бібліятэкі Беларусі" стала адным з самых грунтоўных даследаванняў развіцця бібліятэчнай справы краіны

Кніга, якая прэзентавалася ў Мінску, ужо выклікала цікавасць розных спецыялістаў. "Выданне дае магчымасць чытачам здзейсніць гістарычны экскурс у беларускую культуру IX-XX стагоддзяў", — упэўнены намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі. Ён адзначыў таксама, што ў апошні час вельмі дынамічна развіваецца выдавецкая справа. Кнігі, выдадзеныя ў краіне, запатрабаваныя і за яе межамі, пра што сведчаць шматлікія ўзнагароды, атрыманыя на міжнародных выставах. Тадэвуш Стружэцкі нагадаў і пра сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і Міністэрства культуры аб штогадовай перадачы буйным бібліятэкам свету 100 лепшых беларускіх кніг.

А першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч ўпэўнена, што кнігу Рамана Матульскага чакае вялікая будучыня ў айчынных бібліятэках. На прэзентацыі выдання яна і зачытала аўтару падзяку за шматгадовую плённую працу міністра інфармацыі Беларусі Алега Праляскоўскага.

Старшыня Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны адзначыў, што любая краіна дасягае поспехаў у тых сферах жыцця, у якіх мае глыбокія гістарычныя карані, а для Беларусі гэта бібліятэчная справа. Уладзімір Шчасны таксама ўручыў Раману Матульскаму дыплом за значны ўклад у развіццё супрацоўніцтва з ЮНЕСКА.

Выданне прысвечана развіццю кніжнай і бібліятэчнай справы Беларусі ў кантэксце нацыянальнай і агульнаеўрапейскай гісторыі X-XXI стагоддзяў.

КРЫЖАВАНКА

Над рэчкаю Цною

У Ганцавічах адсвяткавалі Дзень беларускага пісьменства

Па гарызанталі: 1. "Савецкае …". Ганцавіцкая райгазета, рэдактар якой – Канстанцін Мохар, адзін з старэйшых журналістаў Беларусі. 4. "Ёсць ціхі … над рэчкай Цною". З верша " Ганцавічы" Міхася Рудкоўскага, сёлета яго 75-я ўгодкі. На Ганцаўшчыне, у роднай вёсцы паэта Востраў, яму прысвечаны музей. 7. "Тут у поймах, дзе Нача і …,\ Засталіся мае ўспаміны". З верша "Навагодняя паштоўка землякам" Віктара Гардзея, імя якога носіць вуліца ў яго роднай вёсцы Малыя Круговічы. Сёлета ў жніўні пісьменніку 65 год. Віншуем! 8. Вёска на Ганцаўшчыне, малая радзіма пісьменнікаў Уладзіміра Марука і Івана Кірэйчыка. 10. "Тураўскае …". Старажытны рукапісны помнік XI стагоддзя, самая ранняя кніга, створаная на беларускай зямлі. 14. "… і апавяданні беларусаў-палешукоў". Зборнік твораў этнографа і фалькларыста Аляксандра Сержпутоўскага, які доўгі час жыў і працаваў на Ганцаўшчыне. 15. Сымон …. Беларускі асветнік XVI стагоддзя, выдаў сваю кнігу "Катэхізіс" на беларускай мове. 16. "Так рупная пчала\ Умее ў … мёд сабраць і з горкіх кветак". З верша "Летапісец" Максіма Багдановіча. Сёлета – яго 120-я ўгодкі. 17. Прадукт творчай працы. 20. "І на чысты ліст пасля сцякаюць\ Іх каструбаватыя …". З верша В. Гардзея " Мясцовыя паэты". 21. Асаблівасці думак, розуму і звычак. 26. Васіль …. Журналіст, пісьменнік, аўтар кнігі "Трое з-за Лані" і інш. Жыў і працаваў у Ганцавічах, там яго імя носіць вуліца і раённая бібліятэка. 28. Гатунак белай гліны. 29. Паэт, пясняр (гіст.). 30. Назва вадасховішча на Ганцаўшчыне, а таксама вёскі, дзе створаны Музей рыбы. 31. "Легенды і … Ганцаўшчыны". Кніга, выдадзеная работнікамі Ганцавіцкай райбібліятэкі.

Па вертыкалі: 2. … ластаўка вясну не робіць (прык.). 3. "… роднае – вечнасць мая". З верша Івана Кірэйчыка "З родным словам". 5. Узаранае поле. 6. Стан разважання, засяроджанасці. 7. Трэск, лусканне. 9. Бацькаўшчына, радзіма. 11. Мера зямельнай плошчы (скар.). 12. Палоска, якой акантаваны малюнак, табліца. 13. Навукова-даследчая база Цэнтральнага батанічнага сада НАН Беларусі на Ганцаўшчыне. 18. "… да святыняў". Навукова-асветніцкая экспедыцыя, якую ладзіць пісьменніца Ніна Загорская: удзельнікі экспедыцыі ў 18-ы раз бралі ўдзел у святкаванні Дня беларускага пісьменства. 19. Верш, які паэтАлесь Каско прысвяціў роднай вёсцы. ("Калі не цуд, што мой выток, мой Чудзін –\Палескіх казак даўні чарадзей"). Сёлета ў паэта 60-я ўгодкі. Віншуем! 22. "Сінія …". Зборнік вершаў М. Рудкоўскага. 23. Буйная жывёліна з доўгай поўсцю і рагамі. 24. Вучы …, вучыся і ў народа (прык.). 25. "Яшукова …". Легенда, якую запісаў Якуб Колас на Ганцаўшчыне, калі настаўнічаў у вёсцы Люсіна (вёска Цельшына ў трылогіі "На ростанях"). 27. … або Гаёвы дзед. Паводле міфа, дух, які сочыць за парадкам у лесе.

Падрыхтаваў **Лявон Целеш**



Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1. Пальесе. 4. Гарадок. 7. Лянь. 8. Іўга. 10. Бязмежце. 14. Казкі. 15. Бугаі. 16. Сотні. 17. Твор. 20. Радкі. 21. Скіда. 26. Прасцягуй. 28. Аляк. 29. Баян. 30. Лактышы. 31. Падманні.

Па вертыкалі: 2. Адна. 3. Слова. 5. Радна. 6. Опум. 7. Лусканг. 9. Аўчына. 11. Га. 12. Акантоўка. 13. "Журавінка". 18. Дагора. 19. "Чудзін". 22. Брадні. 23. Як. 24. Народ. 25. Гара. 27. Іаон.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E—mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.

Тыраж: 1945, **Заказ:** 939

Час падпісання ў друк: 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». *ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск*

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2011